Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
6 МАЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 85 (28195) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Чарамша пад забаронай**

СТАР. 4



**Чэмпіянат свету пад небам Піцера**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Аснова асноў — гэта эканоміка. Будзе развівацца эканоміка, будуць людзі мець высокааплатную работу, нармальныя перспектывы, тады будзе ўсё нармальна і ў дзяржаве. Я думаю, што гэта будзе лейтматывам V Усебеларускага народнага сходу. Нагадаю, што Беларусь захавала вядучую ролю прамысловай краіны на постсавецкай прасторы. Такія вядомыя маркі, як БелАЗ, МАЗ, «Гомсельмаш», МТЗ, захавалі і развілі свае пазіцыі. За апошнія 15 гадоў мы сур'ёзна дабавілі, развіваючыся з тэмпамі росту 8,2% штогод. Гэта ацэнка Сусветнага банка і ААН, і яна цалкам карэлюецца з нашымі данымі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19389,00 | ▼ |
| Еўра | 22246,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 294,31 | ▲ |
| Укр. грыўня | 771,39 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Плывуць кулікі



Птушкі на гэтым фота ёсць, і яны сапраўды плывуць. Кулікі, якія ў гэты час такуюць на Тураўскім лузе, знаходзяцца ў невялікіх мяшэчках на грудзях дзяўчат у чоўне. Гэта валанцёркі адзінай у краіне станцыі кальцавання птушак, якая знаходзіцца на ўскраіне старажытнага Турава, вяртаючца з палявых работ, везучы адлоўленых птушак на кальцаванне.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Нашы

## Ацэнка прафесіяналаў

**Па традыцыі ў Дзень друку Беларускі саюз журналістаў уручыў узнагароды прадстаўнікам айчыннай медыясупольнасці. Прэстыжную прафесійную ўзнагароду — «Залатое пяро» — атрымала і спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» Вераніка Канюта.**

— Сярод пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу «Залатое пяро» ўсё больш прадстаўнікоў рэгіянальных газет і тэлебачання, — адзначыў **старшыня Беларускага саюза журналістаў Анатоль ЛЕМЯШОНАК.** — Якасць публікацый, пададзеных на конкурс, у апошнія гады прыкметна расце. Раней сярод лаўрэатаў маладых журналістаў практычна не было. Цяпер моладзь, якая зусім не шмат прапрацавала ў прэсе, становіцца пераможцамі. Прэмія «Залатое пяро» адрозніваецца ад усіх астатніх і з'яўляецца найбольш прэстыжнай, бо гэта ацэнка прафесіяналаў прафесіяналамі.



Фота БЕЛТА.

■ Браты меншыя

## ЧАЛАВЕК САБАКУ СЯБАР?

### ХТО ВІНАВАТЫ Ў ТЫМ, ШТО НАШЫ ГАДАВАНЦЫ ПАВОДЗЯЦЬ СЯБЕ АГРЭСІЎНА?

**Трагедыю, якая здарылася на мінулым тыдні ў Баранавіцкім раёне, сёння абмяркоўваюць многія. На цяжарную жанчыну напаў пітбуль яе сужыцеля, у выніку чаго ёй ампутавалі абедзве рукі.**

**На шматлікіх форумах і інфармацыйных сайтах гэтая сітуацыя падзяліла людзей на два лагеры: хтосьці абвінавачвае сабаку так званай «небяспечнай» пароды, хтосьці гаворыць пра адказнасць за паводзіны жывёлы яе гаспадара.**

**Якая ж думка бліжэйшая да ісціны і як засцерагчыся ад нападу «сябра чалавека»? Пра гэта «Звязда» спытала інструктара-кінолага Андрэя ШКЛЯЕВА, які больш за 30 гадоў займаецца выхаваннем, дрэсіроўкай сабак і навучаннем іх гаспадароў.**

***— Андрэй Мікалаевіч, ці існуюць пароды сабак, якіх можна назваць патэнцыйна небяспечнымі?***

— Любы сабака можа праяўляць агрэсію, калі яго гэтаму навучыць. І гэта датычыцца не толькі тых сабак, якіх выводзілі для баёў (амерыканскіх стафардшырскіх тэр'ераў і пітбультэр'ераў, стафардшырскіх бультэр'ераў, бультэр'ераў і інш.), а, напрыклад, і службовых (усходнееўрапейскіх аўчарак, нямецкіх аўчарак, ратвейлераў, даберманаў і інш).

СТАР. 13

# ДЗЕЛЯ АГУЛЬНАГА ДАБРАБЫТУ

## Учора Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды

**У пачатку мая беларусы адзначаюць важныя, дарагія і доўгачаканыя святы: светлы Вялікдзень, Першамай, Дзень Дзяржаўнага сцяга і герба, Дзень Перамогі, які Прэзідэнт назваў самай важнай і галоўнай дзяржаўнай урачыстасцю. Па добрай традыцыі да іх прымеркавана ўручэнне высокіх дзяржаўных узнагарод і ўшанаванне найлепшых людзей краіны.**

Пакаленне пераможцаў — тыя, хто выратаваў Радзіму ад фашысцкага зняволення, хто прынёс чалавецтву мір і свабоду, — заяўляла як зрэнку вока берагчы бясцеку краіны, адзначыў Прэзідэнт. «Мы сапраўды ганарымся тым, што Беларусь у цяперашняй трывожнай абстаноўцы па праву лічыцца куткам стабільнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У гэтым вялікая заслуга людзей у пагонах, якія забяспечваюць правапарадак і спакой у грамадстве, ахоўваюць граніцы дзяржавы, процістаяць злачыннасці, абараняючы жыццё і ўласнасць грамадзян, прадоўжыў Прэзідэнт. Найлепшыя прадстаўнікі слаўных структур Беларусі ўдастоены ордэнаў «За службу Радзіме» і медалёў «За адзнаку ў воінскай службе».

Ушаноўвалі ў Палацы Незалежнасці таксама дзеячаў культуры. Гэта не выпадкова, паколькі бягучы год аб'яўлены ў краіне Годам культуры. Таму такая ўвага ўдзелена людзям творчай сферы, якія ўносяць у жыццё прыгажосць і духоўнасць, разнастайнасць пачуццяў, што ўзвышаюць чалавека і абуджаюць у ім найлепшыя якасці. «Ваша творчасць заслугоўвае ўсялякіх пахвал і шырокага прызнання не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Вы з гонарам прадстаўляеце розныя формы, жанры мастацтва, якое, паводле трапнага выказвання вялікага пісьменніка Бальзака, з'яўляецца тварам нацыі», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да прысутных на цырымоніі дзеячаў культуры і мастацтва.

Не менш дастойна былі прадстаўлены педагогі — як школьнага, так і сістэмы вышэйшай адукацыі. За паспяховае ўкараненне эфектыўных метадаў навучальнага і выхаваўчага працэсу, якіх у многіх школах так не хапае, адзначаны высокімі ўзнагародамі дырэктары мінскіх гімназій №4 і №13, настаўнікі Маладзечанскай гімназіі №7, Валожынскай №1. За плённыя навуковыя распрацоўкі, паспяховую педагагічную дзейнасць пры падрыхтоўцы спецыялістаў узнагароджаны прадстаўнікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Нацыянальнай акадэміі навук.

«Асаблівай удзячнасці і павагі заслугоўваюць найлепшыя прадстаўнікі айчыннай медыцынскай сферы. Клопат аб здароўі людзей — наш нязменны дзяржаўны прыярытэт. І ў яго рэалізацыі важную ролю адыгрывае кваліфікаваная работа кожнага звяна, кожнай установы сістэмы аховы здароўя», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў поспехі ўрачоў мінскіх гарадскіх клінічных бальніц №9, №10, дзіцячай №3, Мінскай абласной клінічнай дзіцячай бальніцы.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сярод узнагароджаных ёсць прадстаўнікі і такіх сфер дзейнасці, як будаўніцтва і сельская гаспадарка, дзяржаўнае кіраванне, фізкультура і спорт. «Гэта сведчыць аб тым, што Радзіма цэніць і падтрымлівае кожнага, хто ўносіць годны ўклад у агульны дабрабыт. Ордэны, медалі і высокія званні гэтак жа, як пашана і павага ў грамадстве, заўсёды знаходзяць сваіх герояў», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў прысутных са святамі і заслужанымі дзяржаўнымі ўзнагародамі, паведамляе БЕЛТА. Прэзідэнт пажадаў, каб яны сталі стымулам для новых працоўных поспехаў, творчых дасягненняў. Ён таксама падзякаваў за цёплыя словы, якія выказвалі ўзнагароджаныя ў яго адрас, і гарантаваў, што дзяржава акумулюе і выкарыстае вынікі іх працы ў імя працвітання роднай Беларусі.

# ВЫСЛУХАЦЬ, СУПАКОІЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

## У краіне працягваюцца прамыя тэлефонныя лініі

Задаць свае пытанні можна кожную суботу з 9 раніцы да паўдня. Па традыцыі, на званкі адказваюць старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, іх намеснікі і кіраўнікі спраў.

Такую форму працы са зваротамі грамадзян сталі практыкаваць у пачатку 2015 года. За гэты час тэлефонны званок стаў сапраўдным гарантам вырашэння амаль любой праблемы.

**У гэтую суботу, 7 мая, на пытанні адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васілевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПІРШТУК Баляслаў Казіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч (80172224444).

■ На думку парламентарыя

# Сцвярджаць уласную духоўнасць

## Чаму дэпутат выступае за маральную цэнзуру?



**Засілле на многіх тэлеканалах і інтэрнэтрэсурсах інфармацыі, што прапагандуе жорсткасць, зняважлівасць, для многіх стала прывычным. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Мікалай ІВАНЧАНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, упэўнены: з гэтым трэба нешта рабіць. Адпаведную праблему ён узняў і ў дзень Паслання Прэзідэнта парламенту і народу — задаў кіраўніку дзяржавы пытанне, як абараніць дзяцей і падлеткаў ад шкоднага ўплыву тэлебачання і інтэрнэту.**

***— Мікалай Міхайлавіч, што падштурхнула вас задаць Прэзідэнту пытанне пра інфармацыйную бяспеку?***

— Звароты выбаршчыкаў. Інфармацыя сама па сабе — гэта прадукт, які можа быць як карысным, так і шкодным. Людзі ў акрузе ўсё часцей задаюць пытанне пра тое, што сёння некаторая інфармацыя наносіць вялікую шкоду, асабліва дзецям, і трэба неяк змагацца з гэтым. Імкненні сродкаў масавай інфармацыі зарабіць грошы, камерцыялізацыя жыцця падштурхоўвае іх выкарыстоўваць свой прадукт не ў выхаваўчым ключы, а ў якасці звычайнага інструмента для здабычы грошай. Панаванне на асобных тэлевізійных каналах жорсткасці, сцэн гвалту, фільмаў, дзе прапагандуюцца нястрымнае спажыванне, а таксама падача матэрыялаў, звязаных з культам сілы, парнаграфіяй, выклікае ў многіх пачуццё трывогі. Таму я і задаў такое пытанне Прэзідэнту. Яно лягло на добрую глебу, хоць кіраўнік дзяржавы назваў яго і дастаткова складаным. Ён даў адпаведныя даручэнні.

Мы, беларусы, — высокамаральная нацыя. У аснове нашага жыцця, традыцый ляжаць высокадухоўныя паводзіны, праца, талерантнасць, выхаванне павагі да традыцый нашых продкаў. А прапаганда нейкіх легкаважных ідэалаў, такіх, як прага нажывы, матэрыяльнага дабрабыту любым шляхам, агідная нашаму духу.

Сёння кантэнт замежных тэлеканалаў, інтэрнэту — даступны ўсім. Асабліва ён даступны моладзі, якая імкнецца пазнаць нешта новае. Неабходна дзяржаўная сістэма захадаў. Сапраўды, як слушна заўважыў кіраўнік дзяржавы, інфармацыйную прастору немагчыма агарадзіць плотам, адасобіць яе ад сусветнага інфармацыйнага працэсу. Але абараняць яе трэба.

Я правёў аналіз захадаў, якія прапануюцца ў гэтым рэчышчы ў Расіі, Кітаі, у Еўрапейскім саюзе — нам ёсць чаму павучыцца. Тыя меры, якія выпрацоўваюцца і ў Адміністрацыі Прэзідэнта, і ў Міністэрстве інфармацыі не павінны быць кулуарнымі. Перш чым гэтыя меры будуць прыняты, трэба, каб яны прайшлі пэўную грамадскую экспертызу, ацэнку, абмеркаванне. Таму што гэта мае дачыненне да ўсяго грамадства — і ў першую чаргу моладзі, непаўналетніх.

Асобныя мультфільмы сёння носяць адукацыйную функцыю, а некаторыя, на маю думку, трэба прааналізаваць — ці трэба іх дапускаць да дзіцяці, чыя асова яшчэ толькі фарміруецца. У многіх сучасных мультыплікацыйных фільмах прапагандуецца насілле, ідзе навязванне элементаў перавагі. Гэта, на маю думку, вельмі важная сфера, дзе патрэбны механізмы-рэгулятары. Дзяржава абавязана праз канкрэтны орган ажыццяўляць кантроль інфармацыйнага кантэнту, даступнага для дзяцей і падлеткаў. Безумоўна, перш чым гэта рабіць, трэба распрацаваць агульную сістэму, агульную канцэпцыю.

Вельмі важным, акрамя нарматыўна-прававога рэгулявання, з'яўляецца стварэнне грамадскага інструмента, магчыма, грамадскай рады па маральнасці, дзе можна было б абмяркоўваць гэтыя праблемы, прапановы дзяржаўных органаў па стварэнні такога механізму кантролю і абароны — як дзяцей, так і нашага ўсяго грамадства — ад наплыву «чарнухі».

Трэба, каб была контрпрапаганда — цікавыя акцыі, добрыя фільмы, глыбокія літаратурныя творы, калі хочаце — насаджэнне грамадству высокамаральных узораў. Гэта таксама элемент процідзеяння бездухоўнасці.

***— Напрошваецца пытанне: наколькі ваша прапанова судатыкаецца з цэнзурай?***

— Маральная цэнзура павінна быць — гэта мая пазіцыя. Нельга ўсё, што нараджаецца ў галовах пэўных людзей, распаўсюджваць і дапускаць да яшчэ не сфарміраванай да канца свядомасці дзяцей. Я ў гэтым упэўнены — і як бацька, і як дзед. Мы павінны знайсці такія механізмы, каб абараніць падрастаючае пакаленне ад дрэнных прыкладаў, амаральных ідэалаў, паказаць, што дрэнна, а што добра. Відаць, тут павінна быць цэнзура. Але цэнзура не столькі дзяржаўная, колькі грамадская. Мы самі для сябе ў грамадстве павінны вызначыць, што добра, а што дрэнна. Каб гэта было прынята ўсім грамадствам, а не навязана, як інструмент, зразумелы дзяржаўным службоўцам, чыноўнікам.

***— Не так даўно Палата прадстаўнікоў прыняла законапраект, які прадугледжвае маркіроўку інфармацыйнай прадукцыі па ўзроставых катэгорыях. Ці дастаткова гэтага?***

— Вопыт міжнароднай супольнасці, Еўропы, Злучаных Штатаў паказвае, што там увесь інфармацыйны матэрыял даўно ўжо класіфікуецца па пэўных нормах. Ёсць градацыя, дзе ўсё дакладна распісана: для якога ўзросту які інфармацыйны прадукт больш падыходзіць.

Мы павінны ўдасканальваць нашу класіфікацыю, бо і інфармацыйны прадукт удасканальваецца. Вытворцы імкнуцца падаць яго спажыўцу як мага больш прывабным — у бліскучай абгортцы. Задача дзяржавы і грамадскасці — спадзяюся, усё ж будзе дзейнічаць адпаведны грамадскі орган — даваць уласную ацэнку.

***— А як з інтэрнэт-прасторай?***

— Гэта глабальная сістэма, на якую складана ўплываць. Але трэба. Пакідаць нашу моладзь неабароненай нельга. Калі чалавек пасталее, тады калі ласка, няхай глядзіць, чытае, што хоча. Але для неакрэплых галоў амаральная інфармацыя — гэта спакуса падпарадкавацца нізкім інстынктам. Інтэрнэт-прастора таксама патрабуе абароны.

Прапанова Прэзідэнта, каб гэту функцыю ўзяў на сябе Міжнародны саюз электрасувязі, таксама цікавая, але мы не можам чакаць, пакуль будуць прыняты глабальныя рашэнні. Мы павінны абараняць сваю інфармацыйную прастору ад шкоднага ўплыву.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ДОМ — НА ЦЕШЧУ, КВАТЭРА — НА ЖОНКУ, САМ — ЖАБРАК

**Віктар Альгертавіч з Уздзенскага раёна 7 красавіка мінулага года прачытаў аб'яву ў газеце, што індывідуальны прадпрымальнік з Чэрвеня можа зрабіць лазню. Якасна і ў сціслыя тэрміны. Бакі заключылі дагавор, згодна з якім аб'ект павінен быць здадзены «пад ключ» 12 чэрвеня. Заказчык пералічыў на рахунак прыватніка 45 млн рублёў. Але, як аказалася, той нават і не думаў выконваць свае абавязацельствы. Тэлефонныя званкі ігнараваў, а потым і наогул пачаў пагражаць, што звернецца ў пракуратуру з заявай, што ў яго вымагаюць грошы. Нічога не заставалася чалавеку, як наняць адваката ды звярнуцца ў суд. Суд вынес рашэнне, па якім бізнесмен павінен вярнуць грошы з «працэнтамі» — 72 мільёны рублёў. Ды да гэтага часу рашэнне не выконваецца. З такой скаргай звярнуўся да старшыні Мінаблвыканкама Сямёна Шапіры заяўнік падчас выязнога прыёму грамадзян ва Уздзе.**

Мужчына рос без бацькі з двух гадоў, яму не было на каго спадзявацца, акрамя сябе, усё жыццё працаваў не пакладаючы рук. Цяпер ён слесар на рапсавым заводзе, на рабоце па 12 гадзін штодзень, без выхадных, — пасяўная.

Сорак пяць мільёнаў — гэта гадавая зарплата Віктара Альгертавіча. І калі раней ён матэрыяльна падтрымліваў сваю састарэлую маці, якая 37 гадоў адпрацавала даяркай, то цяпер яна прапаноўвае яму частку сваёй невялікай пенсіі: маўляў, вазьмі сынок, табе грошы больш патрэбны... Крыўдна, балюча.

— У судовага выканаўцы на руках вытворчасць па трох відах даўгоў прадпрымальніка: 150 млн рублёў — аліменты, 30 млн рублёў — штраф дзяржаве, а таксама доўг заяўніку, — растлумачыла начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Мінаблвыканкама Аксана Таранда, якая папярэдне выязджала на месца, каб дасканала разабрацца ў сітуацыі. — У яго апісаны тэлевізар, аўтамабіль і дрэваапрацоўчыя станкі. Пасля іх рэалізацыі перш за ўсё выручка пойдзе на аплату аліментаў, штрафу, а ў трэцюю чаргу — на вяртанне доўгу заяўніку.

Але ён можа застацца ні з чым, калі грошай не хопіць. На адным з прыёмаў грамадзян аб аналагічнай сітуацыі расказала жанчына з Клецка. Яна заказала вокны ў прыватнай фірме, але да гэтага часу заказ не выканалі, ёй вярнулі толькі 15 млн рублёў з пералічаных 150.

— Гэта ж махлярства, крымінал, — абурыўся Сямён Шапіра. — Але, як правіла, у такіх людзей, калі тычыцца справы, няма чаго забраць: дом афармлены на цешчу, кватэра — на жонку, а самі яны нібыта наогул жабракі.

— Звяртайся ў Следчы камітэт, пракуратуру, але там адмовілі ў заводзенні крымінальнай справы. Маўляў, усё вырашым, дапаможам і так, — адзначыў Віктар Альгертавіч.

Яго памылкай было тое, што ён пералічыў махляру ўсе грошы адразу.

— Будзем старацца вам дапамагчы, — паабяцаў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

Сямён Шапіра даў даручэнне спецыялістам аблвыканкама сабраць падобныя справы. З кіраўнікамі праваахоўнага блока будзе праведзена нарада па гэтых пытаннях.

Усяго ж старшыня Мінаблвыканкама выслухаў 13 чалавек.

Ніна Канстанцінаўна і Наталля Мікалаеўна вельмі хочуць, каб у райцэнтры з'явіўся плавальны басейн.

— Сёлета будзем старацца здаць басейн у Валожыне, які будуецца ўжо пяць гадоў, паколькі ў яго былі ўкладзены бюджэтныя сродкі. Новых адкрываць не збіраемся — сітуацыя не тая. У нас ёсць першачарговыя справы. Напрыклад, у Бараўлянах не хапае 10 садкоў для 3200 дзяцей. Сёлета будуецца школа ў Мядзеле, дзе дзеці вымушаны хадзіць на заняткі за некалькі кіламетраў, — растлумачыў Сямён Шапіра.

Два гады таму дзяржава ўклала вялікія сродкі ў добраўпарадкаванне Узды, сацыяльных аб'ектаў. Толькі новы Цэнтр культуры пацягнуў на 300 млрд рублёў. Горад непазнавальна змяніўся, што адзначаюць як самі жыхары, так і госці.

— Перажывём часовыя цяжкасці, будзем далей будаваць, — паабяцаў кіраўнік вобласці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# КУЛЬТУРА БАЧЫЦЦА НА АДЛЕГЛАСЦІ

**Гэтымі днямі ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праходзіць Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры. Яго арганізатарамі з'яўляюцца НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН, Міністэрства культуры краіны.**

**На прадстаўнічым форуме ў беларускай сталіцы сабралася больш як 330 навукоўцаў з Беларусі і замежжа. Учора яны паўдзельнічалі ў пленарным пасяджэнні, наведалі музеі Мінска. Сёння ж, падчас тэматычных секцыйных абмеркаванняў, прадстаўляюць вынікі ўласных даследаванняў у галіне беларускай мовы, літаратуры, фальклорнай спадчыны, архітэктуры, мастацтва.**

Як пачуваюцца замежныя навукоўцы ў Мінску? Што яны маюць сказаць аб нашай культуры? З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да ўдзельнікаў кангрэса, якія завіталі на форум з-за мяжы.



**Арнольд МакМілін, прафесар Лонданскага ўніверсітэта (г. Лондан, Вялікабрытанія):**

— Падчас пасяджэння секцыі я буду расказваць пра сваё бачанне творчасці маладога беларускага паэта, празаіка, перакладчыка Антона Францішка Брыля, унука класіка Янкі Брыля. Гэта вельмі таленавіты і арыгінальны творца. Мой даклад пахвальны. Спадзяюся, што гэты пісьменнік будзе і надалей працаваць на полі беларускай літаратуры.

Я ў Мінску бываю з 1960-х гадоў. Натуральна, за гэтыя гады шмат што змянілася. Я памятаю час, калі тут не было метро, і тралейбусы, што хадзілі па праспекце, былі цалкам поўныя. Я працаваў у Інстытуце мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук і кожную раніцу хадзіў на працу з гатэля «Мінск» пешкі. Але сёння Мінск стаў вельмі сучасным, тут у кавярнях і рэстаранах добрая кава. Выдатна, што я прывёз з Лондана і добрае надвор'е.



**Андрэй МАРОЗ, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык лабараторыі фалькларыстыкі Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта (г. Масква, Расія):**

— Разам з калегамі будзем прадстаўляць вынікі нашага сумеснага з беларускімі навукоўцамі праекта па вывучэнні традыцыйнай культуры беларуска-рускага памежжа. Я прадстаўлю даклад, прысвечаны абраду «Свяча». Калі цэлай вёскай, сям'ёй і нават адным чалавекам на хрысціянскія святы вырабляецца «аброк» — свечка. Яна захоўваецца шмат гадоў і штогод дапаўняецца новымі слаямі воску. У дзень вырабу яна асвячаецца ў царкве і запальваецца падчас службы. Лічыцца, што такая свечка аберагае і ўсю вёску, і кожную сям'ю ад нястач, хвароб.

Праграма кангрэса надзвычай вялікая, яна ўражвае сваёй разнастайнасцю. Гэта першае падобнае мерапрыемства ў Беларусі. Мне вельмі цікава паўдзельнічаць у працы секцыі. Калі з мінскімі, полацкімі калегамі мы падтрымліваем сувязь і час ад часу бачымся на міжнародных форумах, то з вучонымі з іншых рэгіёнаў я зусім не знаёмы. Прыемна будзе пазнаёміцца.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

**Міраслаў ЯНКОВЯК, ад'юнкт Інстытута славістыкі Польскай акадэміі навук, кандыдат філалагічных навук (г. Варшава, Польшча):**

— Чакаю, што на секцыйных пасяджэннях у межах кангрэса будзе шмат цікавых дакладаў, якія тычацца не толькі культуры Беларусі, але і літаратуры, мовы. На форум прыехалі спецыялісты з розных краін, якія прадстаўляюць розныя навуковыя кірункі, школы. Спадзяюся, што будзе магчымасць параўнаць некалькі пунктаў гледжання, навуковых канцэпцый.

Раней я вывучаў беларускія гаворкі ў Латвіі, даследаваў гаворкі паўднёвай Пскоўшчыны, цяпер працую над манаграфіяй, прысвечанай беларускім гаворкам у Літве.

У Беларусь я прыязджаю штогод. І заўважаю, што ў краіне шмат што змяняецца: адрэстаўраваны многія помнікі архітэктуры, з'явіліся новыя будынкі і цэлыя жылыя раёны. Сталіца ідзе наперад, мадэрнізуецца.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

■ Надвор'е

## Прыпячэ, як летам

### Сіноптыкі прагназуюць, што ўжо на наступным тыдні тэмпература паветра будзе дасягаць плюс 25 градусаў

**Даволі цёплае надвор'е чакаецца на гэтыя выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя. Аднак па поўдні нашай краіны камфортныя ўмовы для дачнікаў будуць чаргавацца з навальнічнымі даждамі.**



Дарэчы, першы тыдзень мая больш нагадваў пачатак лета, бо тэмпературны фон утрымліваўся на ўзроўні 1-4 градусы вышэй за кліматычную норму. А надалей нас чакае ўвогуле амаль спякота. У пятніцу на тэрыторыі Беларусі будзе ў асноўным гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску, толькі ўдзень па паўднёва-ўсходняй палове краіны яшчэ пасваволіць невялікі цыклон. Таму ўдзень пераважна па паўднёва-ўсходняй палове пройдуць кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 14-20 цяпла, па паўночным захадзе пры невялікай воблачнасці чакаецца нават да плюс 22 градусаў.

А ў суботу і нядзелю да нас завітае антыцыклон з цэнтрам над Латвіяй, і толькі на поўдні краіны надвор'ем будзе кіраваць франтальны раздзел. Месцамі, пераважна па поўдні, пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 4-11 градусаў, удзень чакаецца ўжо да 16-23 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, цудоўнае надвор'е захаваецца і ў першыя дні наступнага тыдня. З панядзелка па сераду ўдзень кароткачасовыя навальнічныя дажджы чакаюцца толькі ў асобных раёнах нашай краіны, а ўначы ападкаў увогуле не будзе. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5-11 градусаў, а ўдзень пачне прыпякаць да 18-25 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

■ Не абмініце!

## ЯК ШКОЛЬНІКУ СТАЦЬ ВЫДАЎЦОМ?

### Намаляваць комікс, прайсці квэст і атрымаць кніжныя прызы можна будзе на стэндзе Выдавецкага дома «Звязда» падчас выстаўкі «СМІ ў Беларусі—2016»

**На форуме беларускіх СМІ, што пройдзе ў выставачным цэнтры «БелЭкспа» (пр. Пераможцаў, 14) з 11 па 14 мая, самы энергічны часопіс Выдавецкага дома — «Маладосць» — падрыхтаваў для наведвальнікаў незвычайныя цікавінкі. Так, 11 мая з 14 да 15 гадзін будзе працаваць інтэрактыўны стэнд «Комікс-майстар», дзе ўсім прапануюць намаляваць уласны комікс. Завершаныя работы можна будзе прадставіць на глядацкае галасаванне. Дарэчы, сваю кар'еру ў галіне коміксаў маладыя і крэатыўныя мастакі могуць прадоўжыць у адмысловай комікс-рубрыцы «Маладосці».**

12 мая з 12 да 13 гадзін пройдзе акцыя «Чытаем часопіс разам». Падчас яе госці форуму змогуць адчуць сябе прафесійнымі акцёрамі, якія выступаюць на сцэне, бо ім патрэбна будзе прачытаць уголас і на публіку ўрыўкі з надрукаваных у «Маладосці» апавяданняў. Дарэчы, чытаць творы разам з гасцямі стэнда Выдавецкага дома «Звязда» будуць і аўтары!

13 мая «Маладосць» зладзіць адмысловы квэст. З 15 да 16 гадзін наведвальнікі форуму, дзейнічаючы ў камандах, павінны будуць знаходзіць размешчаныя па ўсёй выстаўцы «старонкі «Маладосці», адгадваць загадкі, змешчаныя там, каб дабрацца да галоўнага прыза.

Парадуе гасцей выстаўкі «СМІ ў Беларусі» і часопіс для школьнікаў «Бярозка». Так, 11 мая з 15 да 16 гадзін будзе праходзіць прэзентацыя часопіснага праекта «Я — мастак!». А 13 мая з 15 да 16 гадзін пройдзе прэзентацыя незвычайнага праекта «Аповесць-канструктар» ад «Чытацкага выдавецтва «Бярозка», які чытачу дае магчымасць адчуць сябе выдаўцом.

Атрымаць у падарунак (у абмен на правільны адказ на пытанне з гісторыі гэтых выданняў) выпускі часопісаў «Полымя» і «Нёман» можна будзе 12 мая з 14 да 15 гадзін. А з 15 да 17 гадзін аўтары «Нёмана» будуць прадстаўляць свае творчыя праекты.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by* ■

■ Будзь у курсе!

## ПА ПРАФЕСІЮ ВЫХАВАЛЬНІКА — У ПЕДКАЛЕДЖ

**У сталіцы прынята рашэнне аб стварэнні Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа. Яго заснавальнікам з'яўляецца Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Навучальная ўстанова прапішацца па вуліцы Макаёнка, 29.**

Каледж ствараецца для задавальнення нарастаючых патрэб устаноў дашкольнай і пачатковай школьнай адукацыі сталічнага рэгіёна ў спецыялістах. Менавіта для Мінска сёння найбольш востра стаіць праблема дэфіцыту выхавальнікаў дашкольных устаноў і настаўнікаў пачатковых класаў. Напрыклад, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт размеркаваў сёлета ў сталіцу 31 выпускніка факультэта пачатковай адукацыі, а патрэба горада ў настаўніках пачатковых класаў складала 153 чалавекі. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі кадравая праблема часткова вырашаецца за кошт прыцягнення студэнтаў выпускнога курса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і педагагічных работнікаў пенсійнага ўзросту. Да таго ж работнікам дзіцячых садкоў, якія не маюць профільнай адукацыі, даецца магчымасць прайсці адпаведную перападрыхтоўку.

Два апошнія гады падрыхтоўка выхавальнікаў і настаўнікаў пачатковых класаў з сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыяй была арганізаваная на базе Мінскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання. І вось наступны крок — адраджэнне ў сталіцы педагагічнага каледжа (калісьці ў горадзе дзейнічалі дзве навучальныя ўстановы, дзе рыхтавалі педагогаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй).

**Начальнік сектара прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена ЧАРНЫХ** паведаміла, што першы набор у каледж пройдзе ўжо сёлета. Для арганізацыі прыёму абітурыентаў ствараецца прыёмная камісія.

Набор будзе ажыццяўляцца на дзённую форму навучання на аснове агульнай базавай адукацыі па спецыяльнасцях: «пачатковая адукацыя» (спецыялізацыя «карэкцыйная работа», тэрмін навучання 3 гады і 10 месяцаў) і «дашкольная адукацыя» (спецыялізацыя «сацыяльна-педагагічная дзейнасць», тэрмін навучання — 3 гады і 10 месяцаў).

Завочная форма прадугледжвае навучанне па спецыяльнасці «дашкольная адукацыя» (спецыялізацыя «сацыяльна-педагагічная дзейнасць», тэрмін навучання — 3 гады і 6 месяцаў).

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи, ул. Тельмана, 100** |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, д. 99:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Здание контрольно-технического пункта** | Здание специализированное иного назначения | 132,9 | 110/С-79292 |
| **Здание центральной диспетчерской службы** | Здание специализированное иного назначения | 41,6 | 110/С-79236 |
| **Здание мастерских № 1** | Здание специализированное иного назначения | 802,3 | 110/С-81176 |
| **Административное здание** | Здание административно-хозяйственное | 120,5 | 110/С-79181 |
| **Здание мастерских № 3** | Здание специализированное иного назначения | 415,6 | 110/С-81189 |
| **Здание склада запчастей** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 314,7 | 110/С-79249 |
| **Здание мастерских № 2** | Здание специализированное иного назначения | 831,2 | 110/С-81157 |
| **Здание бытового корпуса** | Здание специализированное иного назначения | 309,1 | 110/С-81197 |

| | |
|---|---|
| **Покрытие** | Площадь, м.кв. – 2 884,0. Материал покрытия – асфальт. Толщина покрытия, см – 4. Материал подстилающего слоя – гравийный. Толщина подстилающего слоя, см – 15 |
| **Забор** | Железобетонные плиты на железобетонных столбах. Общая протяженность, м – 61. Высота, м – 3,0 |
| **Ливневая канализация** | Общая протяженность – 40,0 м. Способ прокладки – подземный. Глубина заложения, м – до 2. Материал: труба чугунная диаметром 100 мм |

**Обременения:** частичная аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 141000000005002742, площадью 1,3168 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы. |

**Начальная цена с НДС 20% – 6 040 414 250 белорусских рублей (снижена на 50%)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.04.2016 г.*

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **17.05.2016 в 14.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Тельмана, 100, актовый зал, ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **16.05.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

■ На скрыжаванні думак

# НечакаНА СТАЎ НІКім?

## Сацыяльны статус настаўніка сёння на парадку дня! І тое, што сітуацыю трэба карэнным чынам змяняць, разумеюць ужо не толькі педагогі

**Ёсць меркаванне, што кожнаму настаўніку трэба найперш самому паклапаціцца пра сваё добрае імя. І гэта справядліва, бо павага да педагога фарміруецца на кожным уроку. Гэта і яго стаўленне да вучняў, і валоданне прадметам, і ўменне знайсці выйсце з самых складаных сітуацый, яго знешні выгляд, асабістыя якасці... Многае, безумоўна, залежыць ад саміх настаўнікаў.**

Але на дзіця ўплывае і тое, што яно бачыць па тэлевізары, чуе на кухні ў размовах бацькоў, знаходзіць у сетцы Інтэрнэт. Між іншым, калі паслухаць размовы («кухонныя» альбо з экрана тэлевізара), атрымліваецца, што роля настаўніка стала даволі нікчэмнай. Мала каго кранае гісторыя сельскай настаўніцы, якая штодня праводзіць урокі з пяццю падлеткамі ў сваім уласным доме, або гісторыя настаўніка-пенсіянера, які застаўся без даху над галавой. Куды цікавей, на жаль, абмеркаваць, як настаўнік пабіўся з вучнем або як настаўніца прымушала дзяцей пісаць даносы адзін на аднаго. Але ж такія выпадкі — рэдкія выключэнні.

Вось асабіста вы (толькі шчыра!) дазваляеце сабе ў прысутнасці дзяцей крытыкаваць настаўнікаў, казаць пра іх зняважліва? А дзеці ж усё матаюць на вус і робяць адпаведныя высновы...

Настаўнік перастаў быць бясспрэчным аўтарытэтам і паважаным чалавекам. Безумоўна, як і ў любой іншай прафесіі, і сярод педагогаў ёсць выпадковыя людзі, але большасць з іх усё ж адданыя сваёй справе і дзецям прафесіяналы. Вось толькі некаторыя з бацькоў ставяцца да іх прыкладна, як да гувернантак або пакаёвак, прасцей кажучы, як да абслуговага персаналу: «Вы не маеце права павышаць голас, ставіць «двойкі», рабіць заўвагі... Вы АБАВЯЗАНЫ вучыць, сачыць, апекаваць, засцерагаць...»

Вядома, абавязкаў у педагогаў — цэлы воз! Але хіба іх няма ў вучняў? Напрыклад, з павагай ставіцца да старэйшых, быць стараннымі, ветлівымі. І чаму толькі настаўнік павінен вучыць і выхоўваць? Няўжо бацькам дастаткова дзіця толькі нарадзіць?

Прааналізаваўшы артыкулы, апублікаваныя ў рэспубліканскіх непедагагічных выданнях за два апошнія гады, у загалоўках якіх згадвалася слова «настаўнік», пераканалася, што яны пераважна былі прысвечаны профільнаму навучанню, вынікам ЦТ і павышэнню заробкаў педагагічным работнікам. Асаблівую ўвагу прыцягнулі менавіта меркаванні аб статусе прафесіі настаўніка. Часта выкладзеная ў артыкулах інфармацыя была негатыўнай, больш за тое, неправеранай і няправільна інтэрпрэтаванай. Напрыклад, была агучана думка, што настаўнікі патрабуюць да сябе занадта шмат увагі, хаця самі не выконваюць свае непасрэдныя абавязкі.

Некаторыя аўтары бачылі вырашэнне праблем у павышэнні заробку. З аднаго боку, з гэтым нельга не пагадзіцца, але ўсё ж прэстыж прафесіі настаўніка не з'яўляецца прама прапарцыянальным яго заробку.

Было б выдатна, калі б у сродках масавай інфармацыі змяшчалася больш матэрыялаў аб штодзённай працы педагогаў і іх дасягненнях. А замест гэтага мы бачым толькі брудныя каментарыі да скандальных гісторый і танныя пошлыя серыялы, якія выклікаюць негатыўнае стаўленне да прафесіі педагога. Настаўнікі падаюцца ў вельмі непрывабным выглядзе: беднасць, прагнасць, запраграмаванасць, неінтэлігентнасць... А гэта зусім не так! У школе такіх людзей сёння няма! Убачыць і паверыць у гэта магчыма, калі зрабіць працу настаўніка празрыстай. Чаму б не арганізаваць шырокую кампанію ў СМІ, падрабязна асвятляць ініцыятывы настаўнікаў, запусціць праграмы пра адукацыю на самых папулярных радыё- і тэлеканалах, праводзіць сустрэчы з настаўнікамі і старшакласнікамі, якія абралі прафесію педагога.

Прыкладам падобнай ініцыятывы, якая дэманструе неардынарнасць беларускіх настаўнікаў, можа стаць традыцыйны «Калядны фэст педагагічнага майстэрства», які штогод праводзіцца на зімовых канікулах у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ў Мінску і збірае больш за трыста настаўнікаў з усёй краіны. Для гэтых людзей паняцце «педагагічнае майстэрства» — не пусты гук. Яно ўспрымаецца імі як найважнейшая прафесійная якасць асобы настаўніка, як патрэба пастаянна ўдасканальвацца ў сваёй прафесіі...

Сёлета, напрыклад, асноўнымі тэмамі V Каляднага фэсту педагагічнага майстэрства сталі выхаваўчы патэнцыял урока і кампетэнтны падыход. Падчас работы прадметных секцый не адзін раз гучала думка пра тое, што ад прафесіяналізму настаўніка, яго кампетэнтнасці залежыць не толькі поспехі вучняў на ўроку, але і іх паспяховасць у дарослым жыцці. Таму ў рабоце настаўніка павінны аптымальна спалучацца сучасныя формы, метады, сродкі навучання, пры якіх развіваецца асоба кожнага вучня. Настаўнік практычна існуе ў рэжыме эксперыменту ў кожную хвіліну ўрока, таму што асноўным прадметам яго даследчай дзейнасці з'яўляецца навучальны працэс.

V Калядны фэст педагагічнага майстэрства яшчэ раз даказаў, што прафесія настаўніка шматгранная, яна не зводзіцца толькі да ведання прадмета і любові да дзяцей. Як бы ні быў прафесійна падрыхтаваны настаўнік, ён проста абавязаны пастаянна ўдасканальваць свае асабістыя якасці і павышаць прафесійны ўзровень. Прыкладам падобнага прафесійнага развіцця для многіх удзельнікаў фэсту сталі члены клуба «Крыштальны журавель» і асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне», якія выступалі ў ролі аўтараў і каардынатараў майстар-класаў і шчодра дзяліліся з удзельнікамі фэсту сваім вопытам, ідэямі і матэрыяламі.

Павышэнне статусу педагога — пытанне складанае. Сэнс яго — у разуменні як агульных, так і індывідуальных задач, у размежаванні, калі так можна сказаць, «паўнамоцтваў» і ў вызначэнні вектараў супрацоўніцтва. Але каб такое супрацоўніцтва адбылося, неабходна не толькі няспынна ўмацоўваць давер да настаўніка пры падтрымцы СМІ, але і ставіцца да сваёй працы з адданасцю ў любой сітуацыі. Чалавека, які ўмее паважаць сябе сам, паважаюць і іншыя. Пагадзіцеся, што той, хто саромеецца сваёй прафесіі, міжволі правакуе негатыўнае стаўленне і да сябе, і да працы, якую выконвае...

Шчасце педагога складаецца з вучнёўскіх перамог, і ад таго, як працуе настаўнік, залежыць, якім стане вучань, ці рэалізуе сябе, ці зможа адаптавацца ў сучасным грамадстве. Школа без настаўніка не мае будучыні, як не мае яго і краіна без школы.

**Інэса ЗУБРЫЛІНА,**
**старшы выкладчык Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, настаўнік англійскай мовы мінскай гімназіі № 24, пераможца Рэспубліканскага конкурсу педагагічнага майстэрства «Настаўнік года — 2011», уладальнік нацыянальнай прэміі «Гонар нацыі»** ■



■ Спажывец

# «Ураджай» чарамшы і... штрафаў

**ВЯСНА... Распускаюцца духмяныя кветкі, узыходзіць зеляніна, спее першая гародніна і... актывізуюцца тыя, хто хоча ўсё гэта прадаць. Абаронцы прыроды кожны год б'юць трывогу з нагоды захаванасці раслін, занесеных у Чырвоную кнігу, падатковая інспекцыя стараецца спыніць масавы гандаль без дакументаў і ў непрызначаных для гэтага месцах — свае сілы яны аб'ядноўваюць у праверачных рэйдах. Разам з імі мы адправіліся на барацьбу з незаконным продажам чарамшы.**

### Знікаючая мядзведжая цыбуля

Чарамша ўвесну з'яўляецца адной з галоўных крыніц вітамінаў для жывёл у лесе. Нават буйны мядзведзь пасля зімовай спячкі дзякуючы гэтай траве хутка аднаўляе свае сілы. Адсюль і другая назва расліны — цыбуля мядзведжая. Людзі таксама актыўна ўжываюць чарамшу ў ежу, яе смак нечым нагадвае часнок. Гэта трава занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, таму збор яе забаронены. Вырасціць яе можна і самастойна, але так цяжка выстаяць перад спакусай узяць у прыроды тое, што яна дае сама.

Звычайна сезон збору чарамшы — красавік—май, але сёлета з-за ўмоў надвор'я ён некалькі скараціўся і ўжо набліжаецца да завяршэння. З рэйдам мы адправіліся на адну з найбуйнейшых гандлёвых кропак горада Мінска — Камароўскі рынак.

— Спачатку трэба звярнуцца да адміністрацыі рынку, толькі ў суправаджэнні яе прадстаўніка мы можам прыступіць да ажыццяўлення нашай работы, — растлумачвае Мікалай Стаскевіч, старшы дзяржаўны падатковы інспектар Савецкага раёна сталіцы. — Фізічнай асобе неабходна мець даведку з месца жыхарства аб тым, што чарамша была вырашчана на яе прысядзібным участку, пацвярджэнне аплаты гандлёвага месца і заключэнне экспертызы аб якасці прадукцыі.

### «Яны не хочуць плаціць штрафы»

Разам мы праходзім па радах. Работнікі адміністрацыі імкнуцца трымацца крыху наводдаль,бо іх яркая жоўтазялёная ўніформа прыцягвае да сябе занадта шмат увагі і прымушае прадаўцоў спешна хаваць нелегальны тавар. Чарамшу знаходзім толькі на адным прылаўку. На здзіўленне — з дакументамі ўсё ў парадку. Аказалася, маладая жанчына гандлюе толькі першы дзень.

— Я прыехала з Клічава. На агародзе мы ўжо некалькі гадоў вырошчваем чарамшу, а вось выставіць яе на продаж адважылася ўпершыню. У мяне дома чацвёра дзяцей, як я магу рызыкаваць? Канешне, я раблю ўсё толькі па законе. Месца каштуе 30 тысяч рублёў у дзень, экспертыза — каля 13 тысяч рублёў. А ці можна так хоць штосьці зарабіць, яшчэ невядома, — разважае жанчына.

Пакуль інспектар уважліва вывучае дакументы, да нас звяртаецца пільная пенсіянерка: «Вы чарамшу правяраеце? Там на выхадзе ёй нейкі мужчына гандлюе».

Пры набліжэнні нашай працэсіі чарамша з яго стала адразу перамяшчаецца ў сумку. Але моцнае хваляванне схаваць у яго не атрымліваецца.

— Дайце мне ваш пашпарт, трэба па базе праверыць, ці не пападаліся вы раней, — мякка патрабуе інспектар.

У базе парушальнікаў чалавека з такімі данымі няма. Тым часам да прылаўка вяртаецца... сапраўдны ўладальнік месца, вось толькі гандлюе ён рознымі гаспадарчымі дробязямі, а свайго прыяцеля Аляксандра зрэдку пускае прадаць ураджай з яго ўласнага агарода.

— Раз такая справа, пакажыце і вы неабходныя для гандлю дакументы, — не забывае пра свае абавязкі падатковы інспектар. — Так, усё ў парадку. А вы, Аляксандр, на першы раз атрымаеце пісьмовае папярэджанне.

— Калі ўстаноўленыя парадкі гандлю парушаюцца другі раз, разборам займаецца раённая адміністрацыя, ва ўсіх наступных выпадках справа пераходзіць у эканамічны суд. Штраф складае ад 10 да 40 базавых велічынь, у залежнасці ад сістэматычнасці правапарушэнняў і атрыманага даходу, — тлумачыць Мікалай Юр'евіч. — Але ўся цяжкасць працы з такімі грамадзянамі ў тым, што яны не хочуць плаціць штрафы. Накопліваюцца велізарныя сумы, а прыцягнуць парушальнікаў да адказнасці вельмі цяжка, бо ў большасці выпадкаў яны належаць да катэгорыі маламаёмасных... Зараз пойдзем лавіць нелегалаў — тых, хто гандлюе неправераным таварам у неўстаноўленым месцы.

### «Мы не будзем з бабулямі ваяваць»

Па вуліцы ад станцыі метро да рынку размясціліся каля 20 гандляроў харчовымі таварамі. Гэтая карціна здаецца настолькі звыклай, што без яе ўжо цяжка ўявіць Камароўку. Гандлююць у асноўным пажылыя людзі, прывабіць пакупнікоў спрабуюць сцвярджэннямі аб тым, што ўсё сваё, натуральнае.

— Падатковая інспекцыя. Чаму правілы парушаем? — пытаецца Мікалай Юр'евіч у жанчыны, якая прадае яйкі і чарамшу.

— Траўка не мая, яе бабуля пакінула, — пачынае апраўдвацца жанчына.

— Ды ў нас у Стаўбцоўскім раёне гэтай чарамшы поўны лес. І ў Асіповіцкім таксама. Яе не тое што людзі — нават каровы ядуць. Дык што гэта за законы такія? — падключаецца іншая.

— Спіс раслін, якія знаходзяцца пад ахоўай закона, вызначаюць вучоныя на аснове сваіх даследаванняў. Чырвоная кніга павінна абнаўляцца кожнае дзесяцігоддзе, апошняя рэдакцыя выйшла ў 2014 годзе — зусім нядаўна. Паверце, проста так чарамша ў гэты спіс бы не трапіла, — тлумачыць нам спецыяліст Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў Марына Мазур. — Дзеянне Чырвонай кнігі распаўсюджваецца на тэрыторыю ўсёй краіны... Мы не маем права выпісваць штрафы на месцах продажу: гэтым займаецца падатковая інспекцыя. Але нашы калегі з абласных камітэтаў рэгулярна праводзяць рэйды ў лясах. Збор чарамшы прыводзіць да накладання штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь.

Пакуль мы разважаем, вакол збіраецца маленькі натоўп.

— Пачым траўка?

— 5 тысяч — пучок, — без сарамлівасці адказвае гандлярка побач з намі.

За дзве хвіліны яна распрадае ўвесь свой тавар. Яе «калегі» нават не думаюць рухацца з месца.

— Яны ўжо добра ведаюць, што без міліцыі мы іх чапаць не будзем, а ў тых і іншых спраў хапае. Максімум, што я магу зрабіць, — гэта выпісаць штраф. Але вы паглядзіце вакол: тут жа адны бабулі! Мы ж не будзем з імі ваяваць. А калі ў каго сэрца хворае? Быў ужо адзін раз такі выпадак, без хуткай дапамогі не абышлося, — разважае Мікалай Стаскевіч. — Дарэчы, пенсіянерам і інвалідам бясплатныя месцы для гандлю выдзелілі на рынках, але ім хочацца стаяць менавіта тут, дзе паток людзей большы. А людзі з суседніх дамоў скардзяцца на неахайны выгляд гэтага імправізаванага кірмашу. Для вырашэння гэтай праблемы патрэбны больш рэзкія меры.

— Пойдзем мы зараз, пойдзем! — пачынаюць наперабой абяцаць прадаўцы. — Можа, вернемся праз паўгадзіны, а можа, і праз месяц. Ці ўжо заўтра з усімі даведкамі на рынку гандляваць будзем, — усміхаючыся падводзіць вынік удачлівая «прадаўшчыца», якая збыла ўсю чарамшу...



**Дар'я КАСКО** ■

# АДЗІН НА ЎСІХ, УСЕ — НА АДНАГО

## У Стакгольме ўсё гатова для старту песеннай гонкі

**Лічаныя дні засталіся да аднаго з самых буйных і папулярных у свеце забаўляльных тэлевізійных шоу — песеннага конкурсу «Еўрабачанне». Калі быць дакладным, конкурс, сімвалам якога сёлета сталі кветкі дзьмухаўца, ужо стартаваў — усе артысты і нацыянальныя дэлегацыі, уключаючы каманду з Беларусі, прыбылі ў шведскую сталіцу і поўным ходам рэпеціруюць, раздаюць інтэрв'ю ды ўдзельнічаюць у шматлікіх афіцыйных, дабрачынных, культурна-асветніцкіх і забаўляльных мерапрыемствах. Аднак тэлегледачы (а да аўдыторыі «Еўрабачання-2016» упершыню далучыліся нават ЗША!) цалкам убачаць гэта свята музыкі толькі 10 мая, падчас першага паўфіналу. 12 мая беларускія заўзятары конкурсу будуць трымаць кулакі на ўдачу нашага прадстаўніка IVAN'а, а ў канцы наступнага тыдня, 14 мая, мы даведаемся імя новага трыумфатара і ўлюбёнца публікі.**

61-е па ліку «Еўрабачанне» аб'яднала ні многа ні мала — 42 краіны, прычым не толькі з еўразійскага кантынента. Нагадаем, з конкурснай дыстанцыі сышла толькі Румынія, якую арганізатары такім чынам аштрафавалі за нявыплату ўзносаў у ЕВС.

Безумоўна, загадзя «а можна ўсіх паглядзець» не атрымаецца, дый, напэўна, бессэнсоўная гэта справа — усе выканаўцы наўрад ці запомняцца. Таму прапануем пазнаёміцца бліжэй толькі з некаторымі ўдзельнікамі шоу, якія могуць быць цікавымі беларускім гледачам.

### УСХОД, ЗАХАД І КРЫХУ ЭКЗОТЫКІ



Бадай, галоўным фаварытам сёлетняга песеннага спаборніцтва лічыцца прадстаўнік Расіі Сяргей Лазараў. Прынамсі, вядучая еўрапейская букмекерская кантора William Hill прымае стаўкі на яго перамогу з высокім каэфіцыентам 3,0 (летась дакладна такі ж быў у шведа Монса Зелмерлёва, які ў выніку і выйграў «Еўрабачанне»). Нягледзячы на такія авансы — а можа, і ў памкненні іх апраўдаць, — артыст разнявольвацца не стаў і прыляцеў у Стакгольм адным з першых. Лазараў уразіў міжнародную прэсу надзвычайнай працаздольнасцю і сапраўды эфектным нумарам — не толькі высокатэхналагічным, але і акрабатычным!

Шанцы Украіны, якая летась прапусціла конкурс па вядомых прычынах, папярэдне ацэньваюцца не вельмі высока — у спісе букмекераў на перамогу спявачка Сусанна Джамаладзінава, больш вядомая як Джамала, стаіць толькі 8-й. Тым не менш артыстка прымусіла гаварыць аб сабе задоўга да пачатку «Еўрабачання», падрыхтаваўшы да конкурсу песню «1944», якая прысвечана рэпатрыяцыі крымскіх татар. Многія былі ўпэўнены, што за такі ход Джамалу дыскваліфікуюць (нагадаем, на «Еўрабачанні» забаронены песні з палітычным падтэкстам). Аднак арганізатары палічылі, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе не пра палітыку, а пра гісторыю, з якой факта не выкінеш, і песню да ўдзелу дапусцілі.

Не палохайцеся адчування дэжавю пры зірку на прадстаўніка Літвы Доні Монтэла. Так, гэта ён, пераможца нашага «Славянскага базару — 2008» Данатас Монтвідас, які ўжо выступаў на «Еўрабачанні» ў 2012 годзе і вырашыў зноў паспрабаваць удачы. Спявак не ўтойвае, што марыць прывезці еўрапейскае шоу ў Літву. Чаму б і не — другая спроба, як пацвердзіў Дзіма Білан, бывае ўдалай, так што няма перашкод жаданню патрыётаў.

Не першы раз штурмуюць конкурс таксама Полі Генава з Балгарыі, Іра Лоска з Мальты, спявачка Каліопі з Македоніі і некаторыя іншыя артысты, якія раней выступалі ў складзе калектываў.

...Тэндэнцыя апошніх гадоў, што назіраецца і на цяперашнім «Еўрабачанні», — так званыя музычныя легіянеры, якія пражываюць ці з'яўляюцца грамадзянамі адной краіны, а выступаюць за другую. Вось так і атрымліваецца, што фармальна Турцыі, якая байкатуе конкурс з 2013 года, і сёлета ў шэрагах удзельнікаў няма, а фактычна — турэцкі артыст Серхат Хаджыпашаліаглу прадстаўляе Сан-Марына. Заўважым, Серхат, які з'яўляецца адным з самых узроставых удзельнікаў 61-га «Еўрабачання» (яму за 50), па першай адукацыі стаматолаг і толькі потым тэлевізійны прадзюсар і спявак.

Ці ўзяць Францыю, прадстаўнік якой Амір упэўнена трымаецца ў лідарах паводле прагнозаў букмекераў. У генеалагічным дрэве ізраільцяніна Аміра Хадада, акрамя яўрэйскіх і французскіх каранёў, прысутнічаюць таксама іспанскія, мараканскія і туніскія галіны. Дарэчы, Амір — будзеце смяяцца — таксама атрымаў прафесію стаматолага, але паўдзельнічаў у талент-шоу ў Ізраілі, затым у Францыі, і з зубалячэбнай практыкай развітаўся на карысць кар'еры.

Нязвыклую заяўку сёлета зрабіла і Фінляндыя: ніякіх там брутальных рокераў-скандынаваў, спявачка Санд'я па маці — індыянка з доляй гаянскай крыві (Гаяна — краіна ў Паўднёвай Амерыцы. — **Аўт.**). А яшчэ яна прафесійная медсястра і вопытны кікбаксёр з шэрагам медалёў.

Але, бадай, самага экзатычнага дэлегата на «Еўрабачанне» абрала леташняя дэбютантка Аўстралія. Гэту заморскую краіну прадстаўляе пераможца нацыянальнага шоу «X-Factor» этнічная карэянка Дамі Ім, якая ў свае 28 гадоў мае на творчым рахунку 4 альбомы і вялікія планы на будучую музычную кар'еру. Букмекеры, дарэчы, бачаць спявачку ў топ-5 лідараў конкурсу, прымаючы стаўкі на яе перамогу з каэфіцыентам 1:15.

### НАШЫ ЛЮДЗІ Ў СТАКГОЛЬМЕ

2 мая адправілася ў Швецыю і беларуская дэлегацыя: спявак IVAN, некалькі шведскіх бэк-вакалістаў, прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі і супрацоўнікі прадзюсарскага цэнтра Віктара Дробыша. З сабой прывезлі баявы настрой, прома-прадукцыю і сувеніры для прыхільнікаў (у тым ліку традыцыйныя дыскі, майкі, «фірменны» алкаголь), а таксама абяцанне здзівіць-такі Еўропу выступленнем «ню» і жывымі ваўкамі на сцэне.

Для тых, хто прапусціў нацыянальны адбор ці наўпрост любіць задавацца пытаннем «хто гэта?», напомнім: IVAN — сцэнічны псеўданім ураджэнца Гомеля Аляксандра Іванова. 21-гадовы юнак з музычнай сям'і некалькі гадоў таму перабраўся ў Санкт-Пецярбург, паспяхова выступіў у некалькіх конкурсах, удзельнічаў у тэлепраекце «Галоўная сцэна», дзе трапіў пад крыло вядомага прадзюсара Віктара Дробыша і ў выніку стаў адным з артыстаў, якія паехалі на «Еўрабачанне» ад Беларусі, так бы мовіць, праз Расію.

Для еўравізійнага шоу каманда IVAN'а прыдумала артысту яркі сцэнічны вобраз — цяпер адным ён нагадвае друіда, другім персанажа ірландскіх казак або героя фільма «Аватар», але галоўнае, што дакладна затрымліваецца ў памяці.

Ужо 4 мая адбылася першая рэпетыцыя нашага ўдзельніка ў Стакгольме. Яе чакалі з асаблівым нецярпеннем. Яшчэ б: чаго ў прадзюсара Віктара Дробыша не адняць, дык гэта ўменне правакаваць і падаграваць інтарэс публікі. Таму журналісты напружыліся ў чаканні скандалу — выйдзе беларус без адзення і будзе дыскваліфікаваны, альбо папярэдняя піяр-кампанія



была толькі фікцыяй, і тады артыста абвінавацяць у падмане чаканняў? І што б вы думалі — аркестр, туш! — камандзе пастаноўшчыкаў нумара Беларусі ўдалося і выканаць усе правілы конкурсу, і стрымаць абяцанне: IVAN на сцэне аголены і з ваўкамі. Як так?! Выйсце насамрэч, як і прадказвала «Звязда», знойдзена элегантнае і простае (хоць у тэхнічным сэнсе, наадварот, складанае): артыст і драпежнікі — гэта галаграмы! Што называецца, ведай нашых. Наогул, у нумары нечакана многа дзеючых асоб, пры гэтым правіла конкурсу, паводле якога колькасць выступоўцаў абмежавана 6 чалавекамі, зноў-такі не парушанае. У чым сакрэт — раней часу раскрываць не будзем, каб не сапсаваць інтрыгу. Паводле інфармацыі калег, якія знаходзяцца цяпер у Стакгольме, еўрапейская прэса і заўсёднікі конкурсу прынялі выступленне беларуса больш чым цёпла, і неафіцыйныя стаўкі на паспяховы выхад спевака ў фінал рэзка ўзляцелі ўверх — уласна, як і заклікае песня «Help you fly».

### РЭЧЫ, ЯКІХ ВЫ НЕ ЎБАЧЫЦЕ

Мяркуючы па першых рэпетыцыях, па творчым напаўненні 61-ты песенны конкурс чагосьці рэвалюцыйнага не абяцае. Як заўжды, будуць нумары з пераапрананнем (сёлета такія прадставяць як мінімум Ніна Кралыч з Харватыі і прадстаўніца Мальты Іра Лоска), будзе лёгкі кавалачак цяжкага року ад прадстаўнікоў Кіпра, гурта «Minus One» (вы іх лёгка пазнаеце па каляровай барадзе гітарыста Харыса Пары і музыках за кратамі), будуць арыгінальныя прыдумкі (скажам, спявачка Івета Мукучан з Арменіі выступіць у акружэнні 3D-праекцый... самой сябе), будуць модныя фрыкі (напрыклад, прадстаўніца Германіі Джэймі-Лі Крывіц выступіць у вобразе жывога персанажа коміксаў аніме, а Рыка са Швейцарыі няўмольна нагадвае Мальвіну сваімі блакітнымі валасамі). Яшчэ будзе як ніколі шмат прыгожых дзяўчат — сольных спявачак у гэтым годзе 21, або роўна палова ад усіх удзельнікаў конкурсу. Але ўсё гэта мы ўбачым падчас паўфінальных і фінальнага канцэртаў, таму лепш згадаем, чаго на сёлетнім «Еўрабачанні» не будзе.



Фота: www.eurovision.tv.

Галоўнае «не» — не будзе ранейшай схемы галасавання, паводле якой пераможца часам рабіўся відавочным задоўга да канца шоу. Паводле змененых правілаў, ацэнкі нацыянальных журы і гледачоў будуць абвешчаны паасобку, каб зрабіць конкурс больш захапляльным і пратрымаць інтрыгу як мага даўжэй.

Таксама не будзе асабліва шыкоўных нацыянальных вечарынак і празмернай колькасці атрыбутыкі «Еўрабачання» па ўсёй шведскай сталіцы. Крызіс прымусіў нават багатыя краіны не тое каб зацягнуць паясы, але істотна перагледзець схему выдаткаў. Наогул, бюджэт шоу 2016 года, паводле папярэдніх ацэнак арганізатараў, мусіць скласці не больш як 120 мільёнаў шведскіх крон (каля 13 мільёнаў еўра).

Як стала вядома днямі, на канцэртах «Еўрабачання» не будзе пэўных сцягоў — арганізатары афіцыйна забаранілі дэманстрацыю сімволікі Крыма, Палесціны, ДНР, Косава і некаторых іншых аўтаномій, а таксама сімволікі ІГІЛ. Калі апошні пункт цалкам лагічны, то наконт усіх папярэдніх разгарэўся шэраг скандалаў.

Зрэшты, думаецца, для беларусаў усе названыя факты далёка не самая значная нагода для перажыванняў. Куды больш сумна, бо ў каторы раз за 13 гадоў, што наша краіна ўдзельнічае ў конкурсе, на сцэне «Глобен-Арэны» зноў не прагучыць песня на беларускай мове... Але гэта, безумоўна, асобная тэма, якая датычыцца не толькі і не столькі «Еўрабачання». Пакуль жа, шаноўныя гледачы — настройцеся на музычную хвалю, глядзіце вачыма, а галасуйце сэрцам!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## Серада, 11 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10 Меладрама «Не пакідай мяне!». 1—2-я серыі.**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.55 Серыял «Дом з лілеямі». Заключная серыя.**
**12.10 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.15** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Лёс гігантаў.
**16.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Беларусь.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55 Серыял «След».**
**0.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**0.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** Азбука густу.
**9.35 Серыял «Класная школа».**
**10.30** Я хачу гэта ўбачыць!
**11.05 Кінааповесць «Аты-баты, ішлі салдаты...».**
**12.40 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.30, 22.15** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30, 0.25** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.15 Дэтэктыў «Снег і попел». 1—2-я серыі.**
**18.25** Капейка ў капейку.
**19.05** «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
**21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.15** Серыял «Быць чалавекам».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 14.30, 18.50, 21.00** «Калейдаскоп».
**7.50, 14.45** «Размаўляем пабеларуску». Тэлевіктарына.
**8.00 «Апошнія дні трэцяга рэйха. Невядомыя староні». Заключны фільм.**
**8.40 «Снайпер. Зброя помсты». Драма. 1—4-я серыі.**
**11.55** «Грані Перамогі». «Салюты Перамогі».
**12.20, 21.55** «Звычайны фашызм». Дак. фільм.
**14.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака-графіка Анатоля Тычыны.
**15.25 «Радаўніца». Драма.**
**16.40 «Простыя рэчы». Драма.**
**18.25** «Бясконцая радасць вады». Навукова-папулярны фільм.
**19.10, 21.15** «Сэрца з лёду». Лені Рыфеншталь.
**19.50 «Майстар і Маргарыта». Драма 1-я серыя.**
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.35, 23.00** PRO спорт. Навіны.
**7.45** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**9.30** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Данія.
**11.20, 23.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**11.40** Козел пра футбол.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым.
**15.50** Хакей. Чэмпіянат свету. Дзённік.
**16.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Латвія.
**18.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Шахцёр (Салігорск) — «Крумкачы» (Мінск). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

**20.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінляндыя — Венгрыя.
**22.30** Слэм-данк.
**23.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Чэлсі».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Маргарыта Назарава».**
**22.55** «Гарады-героі». Смаленск.
**23.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 «Снайпер 2. Тунгус». Серыял.**
**10.15** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40, 17.45** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Чароўная краіна».**



**15.40** «Цэнтральны рэгіён».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Наша справа».
**17.25** «Міншчына».
**17.35** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.50** «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным».
**0.45 «Мяжа часу». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Культпрасвет».
**9.30 Серыял «Смерць шпіёнам: Крым».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Вой, мамачкі!»
**13.45, 19.20 Серыял «Гаражы».**
**15.30, 3.25** «Справы сямейныя».
**16.20** Дак. цыкл «Народы Расіі».
**17.20 Серыял «Айцец Мацвей».**
**21.05 Маст. фільм «Арфа для каханай».**
**22.55 Серыял «Апантаны».**
**23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.45 Серыял «Шчыт і меч».**
**3.50** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**4.15 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Вестки.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.10** «Ану, бабулі! Ад Буранава да Баку». «Эдзіта П'еха. Рускі акцэнт».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «МУР».**

**19.10, 20.50 Серыял «Вярні маё каханне».**
**21.55, 23.10 Маст. фільм «Нялёгкае шчасце».**
**23.45** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.05** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Таптуны».**
**15.00 Серыял «Аддзел 44».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Законы вуліц».**
**22.30** «Вынікі дня».
**23.00 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

### 8 канал

**7.00, 14.15, 20.00, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 20.05 Серыял «Тыран».**
**8.20, 9.25, 14.00, 15.45, 16.15, 18.10, 19.55, 20.55** «Хатняя крама».
**8.25, 18.20 Серыял «Забі і вылечы».**
**9.30 Серыял «Пад купалам».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Фантастыка «Прывід».**
**12.55 Серыял «Доўгая дарога ў дзюнах».**
**14.20 Серыял «Нашчадкі».**
**16.30 Серыял «Усё спачатку».**
**19.25** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Аперацыя Валькірыя».**
**23.00 Серыял «Штам».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**6.30, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.15** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны 3».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Апошні з Магікян 5».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Вечны адпачынак».
**11.30** Камедыя «Прыгоды Падзінгтана».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Меладрама «За мной апошні танец».
**23.30, 3.30** Серыял «Выжыць пасля 2».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.30** «Гіпакрат». Дак. фільм.
**12.35** «Красуйся, горад Пятроў!» Дойлід Росі.
**13.05** «Наша сэрца». Маст. фільм.
**14.30** «Ключ да сэнсу. Іван Сечанаў». Дак. фільм.
**15.10** «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял.
**17.05, 22.40** «Генрых і Ганна. Каханне, якое змяніла гісторыю». Дак. фільм. 2-я серыя.
**17.55** Прарок у сваёй айчыне. «Пункт адліку — планета Зямля. Мікіта Майсееў».
**18.25** Маскоўскі Велікодны фестываль. Выбранае. Валерый Гергіеў і Сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Больш чым каханне». Габрыэль Гарсія Маркес і Мерседэс Барга Парда.
**21.55** Улада факта. «Стрэлы кемалізму».
**23.45** Мастсавет.
**1.00** «Больш чым каханне». Данатас Баніёніс і Она Бабёнене.
**1.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» «Майскімі кароткімі начамі...» Вядомыя акцёры-франтавікі У. Этуш, У. Трошын, Я. Веснік, В. Розаў, М. Багаслоўскі ўспамінаюць пра ваенныя шляхі-дарогі, спяваюць песні далёкіх франтавых гадоў...
**6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 12.50, 14.30, 15.40, 17.00, 18.50, 20.00, 21.40, 23.00, 0.40, 2.40, 4.10** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Схватка».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Доўгажыхары ТБ «Што? Дзе? Калі?». 2007 год.
**13.10** Маст. фільм «За твой лёс».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар: Юрый Кукін. 2008 год.
**19.00** Маст. фільм «Увесь свет у вачах тваіх».
**20.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Алег Басілашвілі».
**23.15** «Я сама». Тэма: «Я выйшла замуж... позна». 1995 год.
**0.00** «Акулы пяра». Крысціна Арбакайтэ.
**1.20** «Зямля—Паветра». «Сэнсавыя галюцынацыі». 2003 год.
**3.00** Маст. фільм «Юлька».

### EuroSport 1

**3.30, 9.30** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**4.00, 7.00, 10.00** «Дарога да золата».
**4.30, 11.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**6.00, 10.30, 0.30** Веласпорт. Джыра. Агляд падзей.
**7.30, 13.00, 19.45, 21.00, 23.15, 1.30** Скачкі ў ваду. Чэмпіянат Еўропы.
**8.30, 0.15** Watts.
**14.00, 15.30** Веласпорт. Джыра д'Італія.
**15.15, 18.30** Веласпорт. Джыра экстра.
**18.45** Конны спорт. Rolex Grand Slam.

### Камедыя

**0.35** Камедыя «Утаймаванне свавольнага».
**2.15** Камедыя «Шэф».
**3.50** Камедыя «Падарунак з характарам».
**5.25** Камедыя «Халасцячкі».
**7.00** Камедыя «Блеф».
**8.40** Камедыя «Калачы».
**10.10** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**12.10** Камедыя «Ас з асаў».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Замуж на 2 дні».
**17.50** Камедыя «Высокі бландзін у чорным чаравіку».
**19.30** Камедыя «Кур'ер».
**21.15** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**22.55** Меладрама «Красуні».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Доктар I...»
**8.05, 18.50, 1.15** «Падарунак лёсу». Серыял.
**9.50, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 4.25** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Хатні рэстаран».
**12.45** «Магія прыгажосці».
**13.40** «Тайныя знакі».
**14.35** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Каменская». Серыял.

**17.00** «Гульні з прывідамі». Дак. фільм.
**17.50** «Сямейныя дэтэктыў». Серыял.
**20.55, 0.25** «Ганна Герман». Серыял.
**21.55** «Дыетолагі-смяротнікі». Дак. фільм.
**22.45, 5.15** «Зоркі і містыка».
**23.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**2.55** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Камедыя «Хацеў бы я быць тут».
**8.10, 4.05** Драма «Марыя — каралева Шатландыі».
**10.15, 2.10** Камедыя «Усё або нічога».
**12.15** Драма «Вельмі добрыя дзяўчынкі».
**14.05** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць 2: выдатная і небяспечная».
**16.05** Драма «Я — Сэм».
**20.10** Меладрама «Дом ля возера».



**22.10** Трылер «Нічога асабістага».
**0.20** Драма «Галгофа».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Драма «Адна вайна».
**8.10, 2.20** Мюзікл «Стылягі».
**10.30, 4.40** Меладрама «Іронія кахання».
**12.20** Драма «Алеся».
**14.10** Драма «Мы з будучыні».
**16.20** Трылер «Шпіён».
**20.20** Меладрама «Восьмае сакавіка».
**22.10** Іншае кіно. Драма «Паршывыя авечкі».
**0.20** Драма «Сава Марозаў».

### National Geographic

**6.00, 13.35** Гульні розуму.
**6.45** Зрабі або памры.
**7.10, 10.05, 13.10, 14.45, 18.40, 20.10, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.30** Служба выратавання Аляскі.
**8.20, 21.45, 1.40, 4.45** Аўта-SOS.
**9.20, 14.00, 17.50, 19.25** Чалавек супраць YouTube.
**10.50** Незвычайныя промыслы.
**11.40, 21.00, 0.50, 4.00** Сапраўдны суперкар.
**12.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**15.30** На плытах па Юкане.
**16.20** Інстынкт выжывання.
**17.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.30, 2.25** Паранармальнае.
**23.20** Уварванне на Зямлю.
**0.05, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Навука магіі.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Гаражнае золата.
**11.00, 7.10** Рачныя монстры.
**12.00** З любасці да машын.
**13.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**15.00, 5.30** У пагоні за класікай.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Прыродажаны механік.
**19.00** Хуткія і гучныя.
**20.00** Браты Дызель.
**22.00** Скарбы з каморкі.
**23.00** Паляўнічыя на старызну.
**0.00** Ліквідатар.
**1.00** Багажныя вайны.
**2.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Гараскоп на

**АВЕН.** Заўсёды ёсць магчымасць дамагчыся пастаўленай мэты, але метады не заўсёды прыдатныя. Вам варта для сябе вырашыць, што больш значна. Вы можаце захаваць добрыя адносіны са сваімі дзелавымі партнёрамі і адчуваць сябе сумленным чалавекам, а можаце дзейнічаць больш эфектыўна і вырашыць свае пытанні, але пры гэтым давядзецца ісці па галовах. Вам прадастаўляюцца вялікія магчымасці ў матэрыяльным і кар'ерным плане, але разам з ім і няпростае рашэнне.

**ЦЯЛЕЦ.** Мінулае можа нагадаць пра сябе зусім недарэчы, таму не спяшайцеся брацца за новыя справы або даваць якія-небудзь абяцанні. Хутчэй за ўсё, вам давядзецца займацца рашэннем пытанняў, пра якія вы даўным-даўно забыліся. Будзьце старанныя, не паўтарайце памылак і не пускайце ўсё на самацёк, інакш гэтыя хвасты так і будуць цягнуцца за вамі ўвесь час і ў непадыходзячы момант зноў нагадаюць пра сябе. Рух наперад будзе давацца няпроста і без належных намаганняў запланаванае не здзейсніцца.

**БЛІЗНЯТЫ.** Для вас гэты тыдзень будзе вельмі ўдалы, асабліва ў тых сферах жыцця і справах, дзе трэба праяўляць актыўнасць і настойлівасць. Любоўныя прыгоды могуць парушыць вашы планы. У парыве пачуццяў давядзецца перагледзець свой распарадак на тыдзень, але, з іншага боку, трохі спантаннасці дазволіць развеяцца і адкрыць для сябе нешта новае. Вялікая колькасць кантактаў і зносін на працягу тыдня дазволіць наладзіць адносіны з людзьмі, атрымаць новую і карысную інфармацыю, але не варта планаваць спраў, якія патрабуюць уважлівасці і ўседлівасці.

**РАК.** На працы давядзецца прыкласці шмат намаганняў, бо колькасць спраў можа рэзка ўзрасці, а пакідаць іх на потым (або даручыць іншым) не атрымаецца. З калегамі магчымыя напружанне і рознагалоссі па працоўных пытаннях. Толькі бліжэй да канца тыдня сітуацыя прыйдзе ў норму. Можаце разлічваць на грашовыя паступленні, якія дазволяць вырашыць бягучыя пытанні, прывесці справы ў адносны парадак. Калі вы збіраецеся развіваць існуючыя адносіны, выводзіць іх на новы, больш сур'ёзны ўзровень (напрыклад, падумваеце аб сумесным жыцці ці дзецях), то гэты тыдзень — самы зручны час для падобнага роду рашэнняў.

**ЛЕЎ.** Удзяліце ўвагу блізкім — ім можа спатрэбіцца ваша дапамога. Вырашаючы паўсядзённыя пытанні, памятайце дзеля чаго і каго вы гэта робіце. Калі ёсць сэнс, то ўсё здзяйсняецца значна прасцей і лепш. Ад вас спатрэбіцца ўважлівасць. Паспрабуйце ні на што не адцягваць увагі і не займацца адразу некалькімі справамі адначасова, інакш можаце ўпусціць нешта важнае. Часам вас будуць дарэмна тузаць з усіх бакоў. Знайдзіце ў сабе сілы, каб адсекчы лішняе і сканцэнтравацца на неабходным.

**ДЗЕВА.** У пачатку тыдня давядзецца засяродзіцца і прыкласці свае намаганні да вырашэння бягучых спраў. Гэта неўзабаве прынясе вынік. Тым не менш не расслабляйцеся раней часу, нягледзячы на ўсе запрашэнні і прапановы, якія могуць паступаць у гэтыя дні. Самымі прыдатнымі для адпачынку і кампаній будуць выхадныя дні, а пакуль удзяліце ўсю сваю ўвагу працоўным задачам.

## Субота, 14 мая

### Беларусь 1

**6.55** Існасць.
**7.20 Меладрама «Парогі». 1-я серыя.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.15, 18.25 Серыял «Сваты-3».**
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.10** Дача.
**11.45** Нашы.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.05 Меладрама «Каханне на сене».**
**15.15** Краіна.
**15.45** «Гумар на вайне, або Смех скрозь слёзы». Дак. фільм.
**16.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Венгрыя — Беларусь.
**21.00** Панарама.
**22.00** Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2016». Фінал. Прамая трансляцыя са Стакгольма (Швецыя).
**1.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**1.25** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.55, 21.05** Тэлебарометр.
**7.00 Серыял «Класная школа».**
**7.35 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**9.55** «Занадта шмат хвастоў».
**10.30** Азбука густу.
**11.05 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**13.05** «Бітва экстрасэнсаў. Апакаліпсіс».
**15.30** Капейка ў капейку.
**16.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Швейцарыя.
**18.25** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**19.30** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**21.10 Фантастыка «Дывергент».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.45** «Lady Блог». Модны праект.
**0.15** Хачу ў тэлевізар!
**0.20 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.25, 16.20, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 12.50, 16.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.25, 19.50 «Майстар і Маргарыта». Драма.**
**9.15, 17.10 «Вясна». Камедыя.**
**11.00** «Выпуск напярэдадні вайны». Дак. фільм.
**11.25 «Балада пра салдата». Драма.**
**13.40** «Час кіно».
**13.50 «Прыгоды маладога пана». Маст. фільм.**
**15.50** «Камертон». Спявак, народны артыст Расіі Рэнат Ібрагімаў.
**16.40** «Полацк і палачане. Беражоныя Еўфрасінняй». Дак. фільм.
**18.55** «Апаленыя ўладай». Берыя.
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Гарачае лета 1968 года». Дак. фільм.
**22.00** Канцэрт Андрэя Бачэлі «Адна ноч у Цэнтральным парку».
**23.45** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**7.15, 22.25** PRO спорт. Навіны.
**7.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Германія — Беларусь.
**9.15, 22.35** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**9.35** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**11.20** Футбол. На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**11.50** Хакей. Чэмпіянат свету. Дзённік.
**12.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Францыя — Фінляндыя.
**14.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Нарвегія — Швецыя.
**16.20** Тэніс. Турнір WTA. Рым. 1/2 фіналу.
**20.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Славакія.
**23.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Казахстан — Латвія.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.45 Камедыя «Марная місія».**
**14.15 Серыял «Абдымаючы неба».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Удача ў прыдачу! З «Еўраопт».
**18.00** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**19.00 Меладрама «Зімовы вечар у Гаграх».**
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35 Маст. фільм «Мой Атыла Марсель».**
**0.25 Маст. фільм «Падарожжы Гулівера».**

### СТБ

**6.20 «Студэнты». Серыял.**
**7.55 Маст. фільм «Нядзельны тата».**
**9.25** «Часткі свету».
**10.00** «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Салдаты 11». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.20 Камедыя «Бландзінка за вуглом».**
**15.20** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.50** «Дзве зоркі на СТБ».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Драма «Азартныя гульні».**
**22.00 «Пасажыр без багажу». Серыял.**

### МІР

**6.00 Маст. фільм «Вусатыя нянь».**
**7.30** «Саюзнікі».
**8.00, 3.10** М/ф.
**8.30** «Медыцынская праўда».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Прыгоды Прынца Фларызеля».**
**13.50** «Цяжар абеду».
**14.20 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота».**
**16.15 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**21.10** «Трымайся, шоубіз!»
**21.40 Маст. фільм «О, шчаслівчык!».**
**23.25 Маст. фільм «Імгненні жыцця».**
**1.05** «Дыяспары».
**1.35 Маст. фільм «Прыватнае жыццё Пятра Вінаградава».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Калі зацвіце багун».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.10 Маст. фільм «Дабравольцы».**
**14.15** «Асабістае. Гоша Куцэнка».
**15.00** «Ха». Маленькія камедыі.
**15.40 Маст. фільм «Чужая жанчына».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**21.00 Маст. фільм «Маша і Мядзведзь».**
**22.40 Маст. фільм «Вернешся — пагаворым».**

### НТБ—Беларусь

**5.45** «Астрапрагноз».
**5.50, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** Кулінарны паядынак.
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.05** «Высоцкая Life».
**14.05** «Люстэрка для героя».
**15.05, 16.20 Серыял «Іржа».**
**18.10** «Следства вялі...».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.40** «Салтыкоў-Шчадрын шоу».
**21.20** «Званок». Пранк-шоу.
**21.50** «Ты не паверыш!»
**22.40 Серыял «Дазнаўца».**

### 8 канал

**9.00, 15.50, 19.15, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.15 Серыял «Забі і вылечы».**
**10.20, 10.45, 15.55, 19.05** «Хатняя крама».
**10.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.00 Серыял «Доўгая дарога ў дзюнах».**
**13.20 Драма «Анкор, яшчэ Анкор».**
**15.00** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**17.25 Камедыя «Брыльянтавая рука».**
**19.20 Трылер «Пад'ём з глыбіні».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Змова».**

### ВТБ

**6.00, 9.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.30** М/ф «Ёка».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Машыны казкі».
**8.30, 17.00** «Ералаш».
**9.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**10.00, 01.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хто каго на кухні».
**12.30** «Здаецца! З рамонтам».
**13.30** Меладрама «Домік у сэрцы».
**15.30** «Уральскія пельмені».
**17.20** М/ф «Артур і мініпуты».
**19.00** «Два галасы».
**20.30** Фантастыка «Пяты элемент».
**23.10, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Дзікія гульні».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Тайна Залатой гары». Маст. фільм.
**11.45** «Зінаіда Шарко. Актрыса на ўсе часы». Дак. фільм.
**12.25** «Невядомы Рублёў і парадоксы рэстаўрацыі». Дак. фільм.
**13.05** Пернікавы домік. «Падарункі для птушак».
**13.35** «На гэтым тыдні. 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**14.00** «Сусветная опера. Рускі след». Дак. фільм.
**14.45** Сусветныя скарбы.
**15.05** «Трыццаць тры». Маст. фільм.
**16.15** «Георгій Данелія. Паміж выдумкай і рэальнасцю». Дак. фільм.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30, 1.55** «Самабытныя плямёны Анголы». Дак. фільм.
**18.25** «Неферціці». Дак. фільм.
**18.35** «Яўген Еўсігнееў. Еўсіці-Геній». Дак. фільм.
**19.15** «Зімовы вечар у Гаграх». Маст. фільм.
**20.40** «Рамантыка рамансa». Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры».
**21.45** Алена Бабенка, Яўгенія Сіманава, Сяргей Галамазаў у тэлевізійным спектаклі «Цэнтр цяжару».
**23.00** «Белая студыя».
**23.40** Кіно на ўсе часы. «Гэты смутны аб'ект жадання». Маст. фільм.
**1.35** «Сландайк-2». М/ф для дарослых.
**2.50** «Навоі». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока». Гурт «Странные Игры». 2-я частка. 2010 год.
**6.55, 8.30, 9.40, 11.00, 12.50, 14.40, 15.40, 17.00, 18.55, 20.30, 23.20, 0.50, 2.00, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Мільёны Ферфакса».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 1-я частка.
**13.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год. Канцэрт Канстанціна Нікольскага.
**13.40** Маст. фільм «Ні пуху, ні пер'я!».
**16.00** «Колба часу».
**18.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2010 год.
**19.20** «Зямля—Паветра». Гурт «Ночные снайперы». 2003 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Блакітныя маланкі».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар: Юрый Кукін. 2008 год.
**1.00** Маст. фільм «Увесь свет у вачах тваіх».
**2.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Алег Басілашвілі».
**5.15** «Я сама». Тэма: «Я выйшла замуж... позна». 1995 год.

### EuroSport 1

**3.30** Футбол. «ФІФА».
**4.00, 7.30, 13.00, 19.00, 23.00, 1.30** Скачкі ў ваду. Чэмпіянат Еўропы.
**5.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы сярод дзяўчат (U-17).
**6.30, 9.30, 0.30** Веласпорт. Джыра. Агляд падзей.
**8.30, 10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**9.15, 18.45** Watts.
**12.00** Конны спорт. Фехтаванне. Кубак нацый.
**14.00, 15.30** Веласпорт. Джыра д'Італія.
**15.15, 18.30** Веласпорт. Джыра экстра.
**20.45** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-17).

### Камедыя

**0.35** Камедыя «Ад 180 і вышэй».
**2.20** Камедыя «Мамусі».
**4.05** Меладрама «Іронія кахання».
**5.40** Камедыя «Шалёныя вылкадчыкі».
**7.15** Камедыя «Замуж на 2 дні».
**9.10** Камедыя «Шэф».
**10.45** Меладрама «Нявеста з таго свету».
**12.25** Камедыя «Падарунак з характарам».
**14.00** Меладрама «Па той бок».
**15.45** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Ас з асаў».
**17.50** Камедыя «Фартуна Вегаса».
**19.30** Камедыя «Кур'ер».
**21.15** Камедыя «Школа зладзеяў».
**23.00** Камедыя «Школа зладзеяў 2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45** «Сардэчна запрашаем дадому!»
**10.35** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.25, 5.20** «Доказ віны».
**12.15, 0.50** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.35** Маст. фільм «Бунт вушастых».
**17.15** «10 самых».
**17.50** «Гучная справа».
**18.55** Баявік «Бой з ценем».
**21.20** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**22.15** Маст. фільм «Казіно «Раяль».
**4.00** «Калі сыходзяць любімыя». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Баявік «Каралі Дагтаўна».
**8.10, 4.00** Драма «Нябачны бок».
**10.25, 2.25** Драма «Настаўнік на замену».
**12.10** Драма «Быць Флінам».
**14.05** Камедыя «Дом Хэмінгуэй».
**15.40** Прыгоды «Лекар: Вучань Авіцэны».
**20.10** Меладрама «Яна».
**22.20** Камедыя «Кухар на колах».
**0.20** Драма «Змоўшчыца».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.30** Драма «Сава Марозаў».
**8.20, 2.20** Камедыя «Елкі 1914».
**10.20, 4.40** Камедыя «8 новых спатканняў».
**12.10** Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**13.40** Меладрама «Кахае не кахае».
**15.10** Драма «І не было лепш брата».
**16.50** Казка «Тайна чатырох прынцэс».
**20.20** Меладрама «Развод па ўласным жаданні».
**22.10** Трагікамедыя «Піянеры-героі».
**0.20** Баявік «На гульні».

### National Geographic

**6.00, 13.30** Гульні розуму.
**6.50** Зрабі або памры.
**7.15, 13.10, 5.40** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Навука будучыні.
**8.30** Дзікае надвор'е.
**9.15** Золата Юкана.
**10.00** Незвычайныя промыслы.
**11.35, 19.25** Сапраўдны суперкар.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.55** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.40** Абаронцы культурнай спадчыны.
**15.30** Місія па выратаванні тыграў.
**16.20** Сучасныя расследаванні.
**17.05** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**17.50, 18.40** Каралі шахт.
**21.00, 22.30, 0.05, 4.50** Асушыць акіян.
**21.45, 1.40, 4.05** Гісторыя Вялікіх Азёр.
**23.20** Расследаванні авіякатастроф.
**2.30** Сутыкненне кантынентаў.

### Discovery

**8.00** Смяротная гутарка.
**9.00, 2.00** Выжыць разам.
**10.00** Паляўнічыя на атруту.
**11.00, 4.40** Ліквідатар.
**12.00** Скарбы з каморкі.
**13.00** Паляўнічыя на старызну.
**14.00** Хуткія і гучныя.
**15.00, 2.55, 6.20** Браты Дызель.
**16.00, 5.30** Прыроджаны механік.
**17.00** Дзікая кухня.
**22.00** Голыя і напалоханыя.
**23.00, 7.10** Футбол 360.
**0.00** Паездка ўлегцы.
**1.00** Аляска: апошні рубеж.
**3.50** Хлопцы з Юкана.

## «УСЁ ТАК, ЯК БЫЛО...»

**Знакаміты фільм Леаніда Быкава пра ваенных лётчыкаў «У бой ідуць адны старыя» з'яўляецца адной з найлепшых савецкіх кінастужак, якія адлюстроўваюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Шмат хто з нас не раз паглядзеў і палюбіў яго. Прапануем нашым чытачам цікавыя факты аб стварэнні кінафільма.**



Леанід Быкаў са школьных гадоў марыў пра неба. У самы разгар Вялікай Айчыннай, пасля некалькіх няўдалых спробаў ён у 1943-м усё ж паступіў у лётнае вучылішча, адкуль праз некалькі тыдняў яго адлічылі, бо быў невысокага росту. Стаўшы артыстам, Быкаў вырашыў чаго б гэта ні каштавала зняць фільм пра ваенных лётчыкаў.

«Эскадрылля, якая спявае» сапраўды існавала ў 5-м гвардзейскім знішчальным авіяцыйным палку, і менавіта там служыў двойчы Герой Савецкага Саюза Віталь Папкоў, які стаў правобразам галоўнага героя Маэстра-Цітарэнкі. Эскадрылля была так названая, таму што ў ёй меўся ўласны хор, а два самалёты былі падораны аркестрам Леаніда Уцёсава.

Адна з найлепшых савецкіх карцін пра вайну была з захапленнем сустрэта гледачамі і высока ацэненая ваеннымі лётчыкамі-франтавікамі. Легендарны лётчык, тройчы Герой Савецкага Саюза, маршал авіяцыі Аляксандр Пакрышкін, да якога Быкаў звярнуўся з просьбай выдзеліць для здымак пару самалётаў ваенных гадоў, прачытаўшы сцэнарый, прадаставіў рэжысёру цэлых чатыры знішчальнікі «Як-18» і чэхаславацкі спартыўны самалёт «Злін Z-326 Акрабат», знешне падобны на «Месершміт».

Падчас працы Быкаў пракансультаваўся з вялікай колькасцю ветэранаў, у выніку чаго шматлікія персанажы атрымалі рэальныя правобразы. Многія іншыя дэталі сцэнарыя таксама былі ўзятыя з жыцця. Малюнак нотнага стану на фюзеляжы знішчальніка «Маэстра» быў зроблены па аналогіі са штурмавіком «Іл-2» Васіля Емяльяненкі, мелі месца і трагічная гісторыя кахання ўзбекскага лётчыка і рускай дзяўчыны, звычка механіка хрысціць перад вылетам самалёты, выпадак, калі Маэстра трапляе ў палон да сваіх і фраза «Я б, таварыш камандзір, яшчэ больш фрыцаў збіў, дык вы сваёй ніжняй бялізнай усіх фрыцаў распужалі».

Пасля таго, як фільм быў ужо зняты, чыноўнікі ад кіно не захацелі выпускаць яго ў пракат, знайшоўшы яго занадта «легкаважным» для твора пра вайну. У гэтай цяжкай для стваральнікаў карціны сітуацыі тымі, хто першымі ўсталі на абарону стужкі, былі Пакрышкін і Папкоў.

Аляксандр Пакрышкін быў і ў ліку першых гледачоў фільма. Славуты лётчык эмацыянальна рэагаваў на тое, што адбывалася на экране, а пасля заканчэння сеансу, з цяжкасцю стрымліваючы пачуцці, прамовіў: «Усё так, як было...», і гэтая фраза стала, бадай, самай высокай ацэнкай работы Быкава і яго калег.



У 1974-м, у год выхаду на экраны, карціну паглядзелі 44,3 мільёна гледачоў. Тады ён стаў адзіным з ваенных фільмаў, які ўвайшоў у дзясятку самых касавых, і чацвёртым у агульным пракаце. Фільм быў удастоены першых узнагарод за акцёрскую работу і рэжысуру адразу на некалькіх айчынных і міжнародных фестывалях. Яго паказалі ў 54 краінах, фільм унесены ў спіс «100 найлепшых расійскіх карцін».

## ВЕЛЬМІ КНІГА СПАДАБАЛАСЯ

**Жыхарка Новай Зеландыі вярнула кнігу ў бібліятэку горада Окленд, узятую ў 1948 годзе. Жанчына захоўвала ў сябе выданне «Міфы і легенды краіны Маары» А.В. Рыда, паведамляе The Guardian.**




Імя жанчыны не паведамляецца. Паводле слоў супрацоўніцы бібліятэкі Зоі Карнэліус, якая прыняла выданне, пенсіянерка забрала том яшчэ дзіцем і збіралася вярнуць яго ўвесь гэты час. «Яна сказала, што ўсе гэтыя гады перачытвала кнігу з вялікім задавальненнем», — сказала Карнэліус. Кіраўніцтва ўстановы даравала жыхарцы Новай Зеландыі доўг у памеры каля 17 тысяч долараў ЗША.

У сакавіку 2016 года ў бібліятэку Дэйтанскага ўніверсітэта (штат Агаё) былі студэнт вярнуў кнігу пра гісторыю крыжовых паходаў, якую ён узяў 49 гадоў таму. Разам з выданнем мужчына пакінуў запіску з прабачэннямі і тлумачэннем прычыны затрымкі.

## ХАЧУ ПІВА Ў КВАТЭРУ!

**Жыхар Чалябінска правёў у сваю кватэру півапровад — з аднаго крана на кухні цячэ вада, з іншага — астуджаны пеністы напой.**



Як прызнаўся Андрэй Ерамееў, механік вышэйшага разраду па адукацыі, ён ажыццявіў сваю мару. Паводле яго слоў, ідэя пабудаваць півапровад — калектыўная і спачатку была проста жартам. Труба вядзе ў размешчаную паверхам ніжэй краму разліўнога піва. Кіраўніцтва гандлёвай сеткі здзівілася такой ідэі, але дало дабро. Быў падрыхтаваны праект перапланіроўкі, які афармілі ў жыллёвай інспекцыі. Адзначаецца, што знаёмыя Ерамеева выстройваюцца ў чаргу, каб прыйсці і паглядзець на дзіва. Пра тое, у колькі абышлася рэалізацыя задумы, мужчына не сказаў.

У студзені 2015 года муніцыпальны савет бельгійскага Бруге даў фламандскаму півавару дазвол на будаўніцтва трохкіламетровага півапровада ад вытворчага цэха, размешчанага ў цэнтры горада, да фабрыкі для фільтрацыі і разліву. Сваю ідэю гаспадары бравары De Halve Maan патлумачылі клопатам аб захаванні гістарычнай спадчыны горада, у прыватнасці брукаваных вуліц у цэнтры Бруге, па якіх даводзілася б ездзіць грузавікам, што перавозяць піва.

## ПРАЗ УРАЛ У ЗАКЛАД

**Жыхарка горада Атырау на заказдзе Казахстана ў заклад пераплыла раку Урал. І тут фігуравала піва — гэтым разам як прадмет спрэчкі.**

Паводле слоў выратавальнікаў, відавочцы ўбачылі жанчыну, якая плыла па рацэ, і папярэдзілі дзяжурную службу. Супрацоўнікі атрада, якія прыбылі на месца, убачылі мясцовую жыхарку, якая сядзела на процілеглым беразе. Калі яны падплылі да яе на маторнай лодцы, каб аказаць дапамогу, то высветлілі, што жанчына выбілася з сіл, а таксама, што яна знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення. Яе перадалі супрацоўнікам паліцыі. «Яна паведаміла сваё імя і прозвішча, сказала, што 1983 года нараджэння. Калі паліцэйскія пацікавіліся ў яе, што ж з'явілася падставай для такога вар'яцкага ўчынку, то плыўчыха адказала, што з кімсьці паспрачалася на 50 куфляў піва. Самае дзіўнае, што жанчына пераплыла раку пры моцнай плыні і пад'ёме ўзроўню вады.

Іван КУПАРВАС.

## Нядзеля, 15 мая

### Беларусь 1

**6.40 Меладрама «Парогі». 2-я серыя.**
8.20 Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Пяцідзясятніцы.
8.30 Народная раніца.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты-3».**
10.50 «50 рэцэптаў першага».
11.45 Нашы.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Камедыя «Праўдзір разнаскурых».**
14.25 Каробка перадач.
15.15 Твой горад.
15.30 Eurovision. Вынікі тыдня.
15.50 Вакол планеты.
16.35 Зона Х. Вынікі тыдня.
**17.05 Меладрама «Ганулінa шчасце».**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
22.10 Клуб рэдактараў.
**22.45 Меладрама «Тарыф «Шчаслівая сям'я».**
0.30 Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.

### Беларусь 2

7.00, 14.10, 21.05 Тэлебарометр.
**7.05 Серыял «Класная школа».**
**7.30 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
9.30 «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
10.35 «Універ-шэф».
11.10 Хачу ў тэлевізар!
11.20 Ваша лато, Пяцёрачка.
**11.50 Серыял «Шчаслівыя разам 2».**
14.45 «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**15.50 Фантастыка «Дывергент».**
**18.20 Фантастыка «Асобная думка».**
21.45 Кіпень.
22.05 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**23.10 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

8.00, 11.15, 13.50, 21.00 «Калейдаскоп».
8.15, 14.05 «Размовы пра духоўнае».
**8.25, 19.50 «Майстар і Маргарыта». Драма.**
9.15 «Бард-парад».
9.55 «Нагерад у мінулае».
10.20 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
11.35 «Дрэва яго жыцця». Барыс Сачанка.
12.00 «Музеі Беларусі». Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Віцебскі мастацкі музей.
12.30 «Святыні Беларусі». Парафія Узвышэння Святога Крыжа (г. Баранавічы).
12.55 «Апаленыя ўладай». Берыя.
**14.15 «Развітанне». Драма.**
16.20 «Гітара па крузе». Аўтар-выканаўца Уладзімір Юркоў.
**17.10 «Нябёсы запаветныя». Трагікамедыя.**
19.10 «Кіно і час». Дзед Талаш. Міф і рэальнасць.
20.40 «Калыханка».
21.20 «Цыганская зорка Міхаіла Слічэнкі».
**22.05 «Пакліч мяне ў далячынь светлую». Кінааповесць.**

### Беларусь 5

7.30, 22.25 PRO спорт. Навіны.
7.40 Тэніс. Турнір WTA. Рым. 1/2 фіналу.
9.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
9.50 Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Швейцарыя.
11.45 Хакей. Чэмпіянат свету. Венгрыя — Беларусь.
13.40, 22.35 Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
14.00 Тэніс. Турнір WTA. Рым. Фінал.
15.50 Хакей. Чэмпіянат свету. Дэннік.
16.10 Хакей. Чэмпіянат свету. Германія — ЗША.
18.25 Хакей. Чэмпіянат свету. Данія — Чэхія.
20.10 Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Фінляндыя.
23.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Матч апошняга тура.

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнды».
**11.30 Маст. фільм «Няскончаная аповесць».**
**13.10 Дэтэктыў «Чыста англійскае забойства».**
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Юбілейны вечар Вячаслава Дабрыніна».
18.00 «Без страхоўкі».
20.00 Контуры.
21.05 «Аффтар жжот».
**22.00 Драма «Адбой».**
0.10 «Міхаіл Булгакаў. Вялікі містыфікатар».

### СТБ

**6.00 «Студэнты». Серыял.**
7.35 «Скардзіцца дазваляецца».
7.55, 17.05 «Аўтапанарама».
8.20 «Самая карысная праграма».
**9.10 Драма «Азартныя гульні».**
11.00 «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 11». Серыял.**
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**13.40, 1.15 Маст. фільм «713-ты просіць пасадку».**
15.10 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.50 «Наша справа».
17.35 «Ваенная тайна».
